"Беларускі калегіюм" пасляхова завяршыў першы вучэбны год. Гэта незалежная адукацыйная інстытуцыя рыхтуе, у прыватнасці, будучых журналістаў. Яе слухачы атрымалі самыя разнастайныя веды і практычныя навыкі. Запланаваныя стажыроўкі ў Польшчы ды Германіі. Сёння цяжка сказаць, ці стануць усе яны журналістамі. Але фактам застаецца тое, што сярод слухачоў "БК" дастаткова здольных і проста таленавітых маладых людзей. Некаторыя з іх ужо даўно працуюць у СМІ, некаторыя толькі пачынаюць.

Сёння мы выпрашылі надрукаваць (з невялікімі скарачэннямі) курсавы праект Дзяніса Носава "Параўнанне інфармацыйнай палітыкі "Радыё ba" і "Радыё РОКС". На наш погляд, праца даволі грунтоўная і цікавая.

РАДЫЁСТАНЦЫІ: БЕЛАРУСКІЯ ЦІ БЕЛО-РУССКИЕ?

Не бывае двух аднолькавых сродкаў масавае інфармацыі ня толькі пры аднолькавых зьнешніх эканамічных і палітычных умовах, але й у аднаго "гаспадара". І адрозьніваюцца яны ня толькі зьнешнім "выглядам", але й падыходам да асьвятленьня розных нацыянальных і сусьветных падзеяў, нават выбарам тэмаў для асьвятленьня, ды формай іх падачы. Што ўжо казаць пра сытуацыю, калі мэдыі не аб'ядноўвае нічога, акрамя агульных прасторы й часу, а заснаваныя ды кантралююцца яны абсалютна рознымі арганізацыямі. Тэмай маёй працы было параўнаць сёнешнюю інфармацыйную палітыку дзьвюх беларускіх радыёстанцыяў FM-дыяпазону – "Радыё ba" ды **"Радыё РОКС"**. Абедзьве станцыі дастаткова даўно працуюць у беларускім этэры; "ba" была заснавана сумесным беларуска-амэрыканскім прадпрыемствам, а **РР** спачатку было расейскім зь вяшчаньнем на гарады розных краінаў былога СССР, а пасьля праблемаў у "цэнтры" менская філія аформілася ў асобную радыёстанцыю. (А вось наколькі захаваліся "старыя сувязі", ці маюць уплыў першыя гаспадары і хто ж яны - пэўны адказ і на гэта пытаньне можа даць аналіз інфар-

мацыйнай палітыкі.)

Для параўнаньня й аналізу інфармацыйных выпускаў я запісаў большую іх частку з абедзьвюх станцыяў на працягу тыдня з 25 сакавіка па 2 красавіка 1999 года. Аналіз засноўваўся ў першую чаргу на адказе на асноўныя пытаньні камунікацыйнага акту:

- Хто прамаўляе?
- Што ён прамаўляе?
- Каму прамаўляе?
- Дзеля чаго, зь якім вынікам прамаўляе?

Цікавымі і карыснымі будуць і назіраньні за іншымі праявамі працы гэтых радыёстанцый, ня толькі непасрэдна за зьместам навінаў. Тым больш што зусім нядаўна адбыліся перамены, у асноўным гэта тычыцца "Радыё **ba**".

На "**ba**" апошнім часам зьмяніўся ня толькі музычны фармат, але й графік выхаду інфармацыйных праграм. І зараз стала цяжэй на іх патрапіць – пакуль прызвычаішся, калі яны пачынаюцца... *Некалькі разоў за дзень навіны выходзяць роўна а пэўнай гадзіне* (напрыклад а 12, 19-й – хаця фактычна могуць і спазьніцца на дзьве-тры хвіліны), *астатнія – без 5-ці, без 3-х, без 6-ці*... Праўда, напрыканцы выпуску ўказваецца час выхаду наступнага – гэта, безумоўна, сэрвіс, але праблемаў ня будзе толькі, калі слухаць штодня ўсё запар. Некалькі разоў замест навінаў выходзяць тэматычныя праграмы – "доктар", "адвакат". Час ад часу "навіны адным радком" выходзяць а палове пэўнай гадзіны, хаця прасьцей усё ж напаткаць зьвесткі пра банкаўска-біржавыя курсы валюты.

Калі на навіны "**ba**" цяжка патрапіць, то на "**РОКС**" пачаць іх слухаць часта проста не хапае цярпеньня. Пакуль адравуць усе застаўкі, пакуль ды-джэй павітаецца, раскажа пра хвалю, гадзіну, цудоўны дзень і харошы настрой... – і толькі тады ўжо павітаецца з дыктарам навінаў, перакінецца зь ім парай фразаў, і нарэшце сам дыктар паўторыць гэткую "забаўляльную праграму" ды вымавіць: "Навіны на "радыё РОКС". Пасьля чаго ізноў адбіўка.

Самі інфа-выпускі робяцца па клясычнай схеме: *анонс некаторых тэмаў ды блёк навінаў на 3-5 хвілін*. На "**ba**" выпускі даўжэйшыя за **РОКС**-авыя, нават ня ўлічваючы выніковае праграмы "Рэдакцыя", што ідзе хвілін 15-20. Ня рэдкія на "**ba**" і *расказы карэспандэнтаў па тэлефоне*, "жывыя" камэнтары ад удзельнікаў падзей; па **РОКС**у ж толькі дыктарскі тэкст.

Але галоўнае для гэтага разгляду – сам тэкст навінаў, <u>пра што</u> ды <u>як</u> расказваецца. І асноўнае, што першым кідаецца ў вушы – ледзь ня поўная адсутнасьць на **РР** беларускіх навінаў. Любых. Затое кароткія блёкі перанасычаны расейскай інфармацыяй, якая займае ня толькі большае, але й першае месца. Плюс нярэдкія нікому не патрэбныя, не прыймальныя для звычайных кароткіх інфармацыйных выпускаў і проста малацікавыя "забаўкі" кшталту вішні ў Штатах ці коней у Конга.

Вось прыклады некаторых інфа-выпускаў на РР (знакам * пазначана тое, што было ў анонсе):

29.03
- * ААН не падцьвярджае зьверствы сэрбаў;
- * Прымакоў паедзе заўтра ў Белград;
- Югаславія просіць грэцкі МЗС;
- 2 В-52 выляцелі з базы;
- пра рынкі інвэстараў у Эўропе;
- пра карэспандэнтаў НТВ у Косава;
- пазастатутныя зносіны з Паўночна-Каўкаскай ВА;
- * *"наша зямлячка"* І. Дарафеева зноў выйграла міжнародны конкурс.

31.03, 11.00
- * Белград гатоў да ўрэгуляваньня;
- * немцы распачынаюць гуманітарную дапамогу;
- * пошукі Г. Шпігуна ў Чачне;
- * на выбарах у мясцовыя саветы Беларусі будуць замежныя назіральнікі;
- праз гадзіну пасьля Прымакова Белград бамбілі;
- перамовы Прымакоў – Шродэр;
- Чарнаморскі флёт гатоў.

27.03 (сб)
- бандыты ў Стаўрапалі;
- нямецкія самалёты ня зьбітыя;
- вынікі 4-га дня налётаў;
- МВФ едзе ў Маскву;
- Renault – Nissan;
- $ - ~~Е~~;
- Ельцын у акулярах.

30.03, 12.00
- * NATO у Македоніі;
- * Прымакоў у Белградзе;
- * землятрус у Індыі;
- журналісты ў Чачне;
- *"вяртаньне гістарычных каранёў"* (!!!) – *масавае* сьпяваньне ў Маскве "Боже, царя храни";
- вішня ў Вашынгтоне яшчэ не зацьвіла (?!!).

Канспэкт некаторых інфа-выпускаў на "ba":

29.03, 14.00 (міжнародныя навіны)
- пэтыцыя ў Гаагу супраць NATO;
- міністар абароны ЗША пра стасункі з Расеяй;
- Клінтан пра ўвод войскаў у Югаславію;
- ня будзе замежных назіральнікаў на судзе над Аджаланам;
- вынікі сустрэчы кандыдатаў у ЭС.

29.03, 16.00
- навіны з Нацбанка РБ;
- пляны на выбары ў Берасьцейскай вобласьці;
- міністар ЗС Нямеччыны пра палітычнае вырашэньне ў Косава;
- NATO пра стасункі з Расеяй;
- 2 В-52 выляцелі з базы.

30.03, 12.00
- * самалёт NATO зьбіты над Чарнагорыяй;
- вынікі налётаў па дадзеных Расеі;
- * Прымакоў прыбыў у Белград;
- * тэлефонная перамова Лукашэнка – Мілошавіч – Прымакоў;
- Кучма едзе ў Славенію;
- пасланьне Ельцына Думе, пра NATO;
- NATO у Македоніі;
- францускі генерал супраць вайны ў Югаславіі;
- Волебэк: "АБСЭ збанкрутавала";
- сумневы ў ЗША наконт вайны;
- спэцпрадстаўнік ААН пра незалежнасьць Косава.

асабісты погляд

Зараз – кароткі "паралельны канспэкт" аднаго дня на РОКС і "ba":

<u>31.03</u> (ср), 12.00 **/"ba"**
- * затоплена 36 раёнаў Беларусі;
- * NATO пашырае бамбардоўкі;
- * у сераду ў маскоўскім мэтро затрыманы з выбухо-вым рэчывам;
- * землятрус у Індыі;
- у Гомелі затрыманы фальшывамонэтнікі;
- двойчы за дзень трывога ў Белградзе;
- сёньня ў Маскве чакаюць Прымакова з Бона;
- Салана: пакуль ня будзе сухапутных войскаў;
- міністар абароны РФ: Чарнаморскі флёт гатовы;
- прэс-служба ФСБ пра абстрэл амбасады ЗША.

/РОКС
- * удары NATO па ўрадавых аб'ектах;
- * амэрыканскія журналісты высланы зь Югаславіі;
- * Ельцын – Кучма;
- * саміт СНДз будзе 2-га ў Маскве;
- два чачэнцы затрыманы ў Дагестане;
- ракета NATO ўляцела ў Македонію;
- "Прагрэс" паляціць на "Мір".

13.00 **/"ba"**
- * урад РБ ухваліў плян рэарганізацыі "Нафтана";
- Гомель: зь 1.04 ліцэнзіі на перавозкі;
- брытанскія бамбардоўшчыкі ня выканалі заданьне з-за надвор'я;
- Салана: пра сухапутныя войскі, пра Прымакова;
- Крэмль пра галасаваньне па імпічмэнту;
- В.Густаў: Расеі ня трэба даваць Югаславіі зброю.

/РОКС
- * Крэмль пра галасаваньне па імпічмэнту;
- * дэлегацыя Ватыкана кіруецца ў Белград;
- * NATO пашырае дзеяньні;
- будзе сустрэча СНДз;
- "Прагрэс" паляціць на "Мір";
- два чачэнцы затрыманы ў Дагестане;
- сёньня будзе матч Італія – Беларусь.

14.00 **/"ba"**
- * амбасада РБ ў Белградзе эвакуіруе беларусаў;
- пасол Цэпкала супраць ядзернае зброі на Беларусі;
- Лінг пра кантракт з Газпрамам, сустрэча Лінга з Лукашэнкам;
- будзе суботнік у Менску;
- левае крыло лейбарыстаў супраць бамбёжак;
- Юзін пра візыт МВФ у Маскву;
- Прымакоў: няма генацыду ў Косава.

/РОКС
- * Прымакоў вярнуўся;
- * Салана пра тэрмін заканчэньня вайны;
- міністар ЗС Вялікабрытаніі пра 3-цюю стадыю атак;
- дэлегацыя Ватыкану;
- Крэмль пра галасаваньне па імпічмэнту;
- два чачэнцы затрыманы ў Дагестане;
- * "чаму ў Італіі прагучыць сыгнал паветранай трывогі" (радыёстанцыі Італіі за мір).

У выніку:

<u>На "Радыё **РОКС**"</u> перавага аддаецца расейскім навінам, яны падаюцца як асноўныя, неабходныя для слухача. Для **РР** навіна – гэта перш за ўсё расейская навіна. Вельмі часта можна пачуць выразы накшталт "Управление правительственной информации сообщило, что на совещании в министерстве..." і гэтак далей, пакуль урэшце ня стане зразумела, што размова ішла пра Расею. Да таго ж чамусьці лічыцца, што слухач дасьведчаны ў расейскіх справах ня менш за інфа-службу – часта даюцца прозьвішчы другасных асобаў у расейскай палітыцы без указаньня, хто ж гэта такі. Досыць часта здараецца падобнае й на "**ba**". Тыповы пачатак для гэткіх "паведамленьняў": "В. Густов считает, что..." Цікава, хто-небудзь у Расеі ведае, хто такі Густаў? І каго шукалі падчас "поисков Геннадия Шпигуна" ў Чачне?

Беларускія навіны на **РР** – падкрэсьлена другасныя. У асноўным яны ці зьвязаныя з Расеяй, СНДз, ці афіцыйна-пратакольныя, ці забаўляльныя з галіны спорту ці папкультуры.

Міжнародная палітычная й каля-палітычная інфармацыя – тая, што выгадная расейскаму афіцыйнаму пункту гледжаньня. Практычна адсутнічаюць навіны з сапраўды блізкага да Беларусі замежжа: Украіны, Польшчы, Прыбалтыкі.

<u>На "Радыё **ba**"</u> айчынным навінам надаецца даволі вялікая ўвага. Яны пастаянна ў анонсе; і палітычныя, і сацыяльныя, і эканамічныя, і культурныя. Адчувальную ступень незалежніцкае й незалежнае пазыцыі дэманструюць паведамленьні пра выказваньні нават афіцыйных асобаў – "**ba**" не ўпускае нагоды даць у эфір іх нязгоду зь верагодным дзяржаўным курсам (напрыклад выказваньне экс-міністра абароны супраць вяртаньня ядзернай зброі). Але часьцяком значная ўвага надаецца ня надта цікавым і мала зразумелым звычайнаму слухачу падзеям (урад пра рэарганізацыю "Нафтана"), далёка не такім істотным, як таго патрабуе першы радок у анонсе (намесьнік міністра ЗС Беларусі ў Радзе Бясьпекі ААН). Праўда, апошняе паведамленьне падкрэсьлівае беларускую прысутнасьць на сусьветнай паліт-арэне, што, для супрацьвагі палітыцы **РР**, ледзьве ня самае галоўнае.

Частыя навіны з рэгіёнаў краіны, што перадаюцца ўласнымі карэспандэнтамі. Практыка вельмі карысная й паважная, але робіцца звычайна мэтадам "левай задняй нагі". Амаль усе правінцыйныя навіны забіты Гомелем (дзе ёсьць уласны карэспандэнт), радзей – Берасьцейскай вобласьцю (у Берасьці прымаецца "**ba**"). Значная частка навінаў цікавая толькі для месца свайго паходжаньня (ліцэнзіі на гарадзкія перавозкі ў Гомелі), да таго ж пераважна ад мясцовай вертыкалі дый падаецца ў нейкім "саветазаваным" стылі ("пляны на выбары ў Берасьцейскай вобласьці"). Увогуле, перажыткі СССР часам ня дрэнна ўладкоўваюцца ў інфа-блёку, як у выпадках з "плянамі на выбары" ад аблвыканкама, ці "плянамі на суботнік у Менску". Проста сярод рэгіянальнае інфармацыі гэта назіраецца часьцей.

Навіны Расеі на "**ba**" падаюцца ў рубрыцы "міжнародныя". У некаторых выпусках яны могуць займаць даволі значнае месца, у некаторых зьяўляцца адным радком; толькі ў выключных выпадках трапляюць ў анонс. Акрамя звыклае для нашых media падачы расейскіх і сусьветных навінаў з прарасейскага прапагандысцкага боку, на "**ba**" ня цяжка пачуць, і нават зь першых вуснаў, думкі супрацьлеглыя. Гэта можа датычыцца розных тэмаў – ад вайны ў Югаславіі ("Расеі нельга аказваць Югаславіі ваенную дапамогу, толькі гуманітарную") да рэфармаваньня СНДз (запіс словаў Беразоўскага супраць імпэрскасьці Расеі).

Даецца й заходні погляд на сусьветныя падзеі ды стасункі Захаду й Расеі (Клінтан пра войскі ў Югаславіі, Салана пра Прымакова). Непараўнальна часьцей, чым на **РОКС**, сустракаецца інфармацыя пра Польшчу ці краіны Прыбалтыкі, увогуле даволі частыя навіны з Украіны, нават пра ейныя стасункі з NATO і безь ніякай адмоўнай афарбоўкі.

Цяпер, пасьля уважлівага праслухоўваньня ды аналізу інфармацыйных праграмаў "Радыё **ba**" і "Радыё **РОКС**" можна сказаць, што гэтыя мэдыі маюць за сымбалі месца й часу ды адказаць на асноўныя пытаньні акту камунікацыі: хто прамаўляе, што, каму й зь якімі вынікамі?

"Радыё **РОКС**" выглядае на прарасейскае радыё. Ягонае "месца" – вялікая прастора Расеі ды тых сумежных зь ёй тэрыторыяў, якія можна лічыць прыналежнымі да "Расейскай імпэрыі на сучасным этапе". І сваю Беларусь, і іншыя постсавецкія краіны **РР** па савецка-расейскай звычцы называе пераважна *рэспублікамі*, нават калі элементарная культура мовы патрабуе сынонімаў. (Хаця, як можна нешта мець супраць FM-станцыяў, калі нават газэта "Навіны" часта робіць тое ж самае?). Такім чынам, паводле разгледжаных намі прыкладаў, цэнтар "тутэйшага" дый сусьветнага палітычнага (і ня толькі) жыцьця – Масква. **РОКС** агучвае расейскі ўрадавы пункт гледжаньня. (Хачу, аднак, дадаць, што тут **не сцьвярджаецца**, што дакладна гэтак і ёсьць на самой справе. Гаворка вядзецца пра тое, што для слухача яно даволі часта **вельмі на тое падобнае**...) Тады за аўдыторыю мусім лічыць:

– *па старой памяці зарыентаваных на "вялікі, магучы"* ў выглядзе Расеі,

– "пятую калёну" новых расейскіх імігрантаў і тых, хто за ўсё жыцьцё ў Беларусі так і не прызнаў сябе за ейнага грамадзяніна,

– ды бізнэсоўцаў, для якіх фінансава-таварны цэнтар, "безумоўна", Масква.

Ува ўсіх выпадках, на маю думку, пажаданы для "заказчыкаў" эфэкт *не дасягаецца. Для людзей старой савецкай* загартоўкі чужы сам фармат вяшчаньня, мадэрновы й камэрцыйны ўхіл, для старых па ўзросту чужая й музыка. Для "шчырых рускіх" ізноў жа ня тая музыка, для іх трэба было *па прыкладу* "**ba**" *пераходзіць на цалкам расейскамоўны* музычны фармат. І першым і другім не падыходзіць асабістая пазыцыя самага прафэсійнага й папулярнага дыджэя Уладзіміра Туза, які ня толькі "антысавэтчык", але й самы "беларус" (акрамя, хіба, Прохарава) на **РОКС**, ня гледзячы, што адзіны сапраўдны "маскаль". А для бізнэсоўцаў, хай і шчыльна завязаных на Расею, проста неабходная беларуская эканамічная інфармацыя, прычым далёка ня толькі курсы па Нацбанку ды ў абменьніках.

Мадэрновы выгляд **РР**, напэўна, скіраваны й на прыцягненьне той часткі аўдыторыі, якая маладая, а нацыянальна ніяк не зарыентаваная. Тут могуць быць пэўныя посьпехі, хаця, думаю, бясконцыя "пераможаваньні" расейскіх палітычных гульняў вельмі хутка надакучаць каму-заўгодна. Будуць слухаць музыку – а эфэкт ад інфармацыйнай "накачкі" будзе практычна нулявы.

"Радыё **ba**" – радыё постсавецкай Беларусі. Для "**ba**", а значыць і для ягонай мяркуемай аўдыторыі Беларусь – новая незалежная дзяржава, каторая тым ня менш не асэнсоўваецца без сваіх калегаў па нядаўна мінулым Саюзе, перш за ўсё без Расеі (хаця гэта й іншая дзяржава, але ж самая для нас важная), і якая дагэтуль натуральна нясе ў сабе шматлікія знакі зь мінулага, напэўна, даволі сьветлага. "**ba**", напэўна, ня вызначылася, і як называць родную Беларусь – па-старому – па-савецку *рэспублікай* ці па-нармальнаму *краінай*. Перавага па звычцы аддаецца *рэспубліцы*, а *краіна* ўжываецца як сынонім, калі ўжо ніяк не абыйсьціся. Аўдыторыя з вышэйсказанага вызначаецца як тыя, хто не прызвычаіўся да новага геапалітычнага становішча, але прыняў яго. Гэта больш-менш самастойныя ў сваіх меркаваньнях людзі, але якія не пазбавіліся некаторых старых стэрэатыпаў. Вельмі моцная прывязка ў іх да расейскай культуры, што й падтрымліваецца ды культывуецца музычным фарматам "**ba**". Тут, пераходзячы да вынікаў гэткай інфармацыйнай палітыкі, трэба адзначыць вялікую супярэчнасьць паміж інфармацыйным і музычным складнікамі вяшчаньня. Большасьці з тых, хто слухае расейскую "папсню", па вялікаму рахунку ўсё роўна, як падаюцца навіны – а большасьць з тых, хто паважае "радыё **ba**" за крыніцу даволі нармальнай у нашых умовах інфармацыі і рэгулярна слухае выпускі навінаў на "**ba**", тую самую расейскую папсню слухаць ні за што ня будзе.

Цікава будзе адзначыць, што сама назва радыё – ***belarus-america*** – дастаткова добра стасуецца зь інфавыпускамі, *але проста абвяргаецца музычным вяшчаньнем*, дзе ня толькі любых заходніх песень не пачуць (акрамя іх расейскіх перапевак), але й беларуская, асабліва беларускамоўная, надзвычайная рэдкасьць. "**РОКС**" жа, наадварот, і ў музыцы, і ў інфармацыі цалкам падцьвярджае сваю гістарычную назву: "Российское Общество Коммерции и Строительства"...

P.S. *Апошнія падзеі, трагічныя ды іншыя, падцьвердзілі* пэўную несамастойнасьць беларускіх недзяржаўных радыёстанцыяў у здабыцьці ды распаўсюду інфармацыі. Да таго ж указалі на магчымы асноўны "кантралюючы" орган у гэ*тае сфэры, асабліва калі справа ідзе пра надзвычайныя* здарэньні. Гэта – Міністэрства ўнутраных спраў (перш за ўсё, як ня дзіўна, – а не ГУОПИ якое-небудзь). Увесь панядзелак 31 траўня ўсе беларускія станцыі <u>слова ў слова</u> *паўтаралі афіцыйнае паведамленьне МУС пра трагедыю*, нават <u>ня робячы спасылак</u> на крыніцу інфармацыі. Толькі "**РОКС**", як не беларускае радыё (як паказана вышэй, хутчэй залежнае ад РФ, а таму менш залежнае ад уладаў РБ), пераказвала ўсё сваімі і крыху іншымі словамі. З-за чаго, дарэчы, тыя станцыі і "падставіліся", бо спачатку нібыта з сваіх зьвестак гаварылі пра п'яных як адну з прычынаў, а потым "высьветлілася", што "п'яных не было".

А праз пару тыдняў ужо й "**РОКС**" разам з астатнімі слова ў слова, але як сваю, перадала інфармацыю пра нейкае сьвяточнае міліцэйскае паседжаньне, не прыбраўшы й не зьмяніўшы ніводнага з ўхвальных выразаў, нягледзячы на іх да немагчымасьці "савецкі" дух...

(Трэба заўважыць, што за час пасьля напісаньня гэтае працы сітуацыя, на шчасьце, крыху зьмянілася. Гэтак, на "Радыё РОКС" значна часьцей гучаць беларускія навіны, а слова *рэспубліка* злоўжываецца не часьцей чым на "ba" ці ў "Навінах". Інфа-выпускі гучаць больш салідна, бо менш перабіваюцца адбіўкамі ды размовамі. Гэткім чынам праца па некаторых параметрах будзе ўжо напамінам пра нядаўняе становішча ў радыё-этэры. Тым ня менш, спадзяюся, карысным.)

Вайна супраць СМІ

Вайна супраць СМІ

War against MEDIA

War against MEDIA

1 ИЮНЬ

Председатель Ошмянского районного исполнительного комитета (Гродненская обл.) В. И. Прокопчик отказался согласовывать вопрос по размещению в районе независимого издания "Ошмянский курьер". В ответе, который он подписал, сообщается: "Исполком считает нецелесообразным размещение газеты на территории района".

Такое решение исполкома является грубым нарушением Закона Республики Беларусь "О печати и других средствах массовой информации", где говорится, что решение о регистрации принимает только Государственный комитет Республики Беларусь по печати. Местные органы власти, согласно статье 10 Закона, должны только согласовать место размещения редакции и ее адрес.

Аналогичный ответ на заявление о регистрации нового издания получил и житель г. Кричева Могилевской области гражданин Тетрадейко В.Е. Заместитель председателя исполкома Зинаида Скачкова, в прошлом секретарь местного райкома партии по идеологии, так же не дает согласия на размещение независимой газеты.

9 ИЮНЬ

Начальник Сморгонского (Гродненская обл.) районного отделения внутренних дел Д.И. Казакевич отказался предоставлять информацию о криминальной ситуации в регионе редактору независимой "Новой газеты Сморгони" Роману Улану. На письменный запрос редакции Д.И. Казакевич ответил, что " ...газета не имеет полномочий на такую информацию". Хотя в статье 32 Закона Республики Беларусь "О печати и других средствах массовой информации" говорится: "Редакция имеет право запрашивать такую информацию о деятельности государственных органов, организаций, общественных объединений, их должностных лиц. Запрашивание информации возможно как в устной, так и в письменной форме. Запрашиваемую информацию обязаны предоставлять руководители указанных органов, организаций и объединений, их заместители, работники пресс-служб или другие уполномоченные на то лица в пределах их компетенции не позднее чем через 10 дней после получения запроса".

Следующая, 33-я статья Закона гласит, что отказ в предоставлении информации возможен, если она имеет сведения, "составляющие государственную, коммерческую или иную специально охраняемую законом тайну".

С таким же письменным запросом "Новая газета Сморгони" обратилась в районное управление статистики, чтобы получить информацию о среднемесячной зарплате. На что был получен ответ: "...подобная информация является коммерческой тайной".

JUNE 1

The Chairman of Oshmiany District Executive Committee (Grodno Region) Mr. Prokopchik refused to grant permission to start up an independent newspaper "Oshmiany Courier". The reasoning behind his decision was that "Executive Committee does not consider it expedient to launch a new paper in the district".

Such decision is in flagrant breach of the Republic of Belarus' Law on Press and Other Mass Media which states, that the State Committee on Press is the sole authority issuing newspaper registration permissions. According to Article 10 of the above Law, local authorities shall only coordinate the location of the newspaper premises.

A similar answer was received by a resident of Krichev (Mogilev region) Mr. Tetradeiko, who applied to set up a new independent paper. The Executive Committee Deputy Chairman Mrs. Skachkova, ex-Communist Party ideological worker, also rejected Mr. Tetradeiko's application.

JUNE 9

The Head of the Smorgon District Internal Affairs Department Mr. Kazakevich flatly refused to provide information on criminal situation in the district to the editor of the independent "New Smorgon Paper" Mr. Ulan. The official claimed that the paper "is not entitled to impart such information". Yet, Article 32 of the Law on Press and Other Mass Media reads: "Newspaper editors are entitled to any such information concerning law-enforcement activities of organizations and individuals. Such information can be requested either in writing or verbally. All the concerned officials shall provide such information within the scope of their authority not later than in 10 days following such request".

Article 33 of the above Law runs that: "Issuing such information is compulsory unless it is classified or otherwise legally constitutes commercial, official or state secret".

"New Smorgon Paper" also requested statistical data on the average income in the district from the local Department of Statistics. The reply followed: "...such information constitutes commercial secret".

Вайна супраць СМІ
War against MEDIA

10 ИЮНЬ

Газета "Шаг" (г. Барановичи, Брестская обл.) опубликовала несколько рекламных статей о местных коммерческих предприятиях. После этого, с интервалом в 2-3 дня, эти фирмы навестили сотрудники ОБЭП (отдел борьбы с экономическими преступлениями). Весьма скрупулезно они проверили деятельность рекламодателей. После этого владельцы коммерческих предприятий сообщили редактору независимой газеты "Шаг" Александру Лабкову, что больше публиковать рекламные материалы не будут.

Ранее аналогичные методы сотрудники Министерства внутренних дел применили в отношении рекламодателей, которые размещали информацию в независимых газетах "Пагоня" и "Биржа информации (г.Гродно), "ТыднеВік Магілёўскі" (г.Могилев), "Витебский курьер" (г.Витебск) и других изданиях.

11 ИЮНЬ

Газета "Белорусская нива" под рубрикой "Кухня политических провокаций" опубликовала статью "Мастера козлетона". В ней шла речь о совместном проекте, который осуществили Российский фонд защиты гласности и Белорусская ассоциация журналистов. Три группы корреспондентов из российских региональных газет поочередно приезжали в Беларусь, где знакомились с ситуацией в области политики, экономики и социальной сферы. После этого в их изданиях появились циклы материалов о союзном с Россией государстве.

Однако автор оскорбительной статьи, опубликованной в "Белорусской ниве", бывший собственный корреспондент печатного органа ЦК КПСС газеты "Правда" Олег Степаненко, взял на себя роль третейского судьи. Рассуждая об одной из публикаций, которую подготовила журналистка из Курска Елена Байбакова, Степаненко допустил ряд грубых высказываний. В частности, он пишет: "...На чем же, спросите вы, свихнулась курская представительница второй древнейшей профессии?", "...курская козлетонщица", "...свою козлиную тягу" и т.д.

Оскорбительные выпады допускаются также в отношении Российского фонда защиты гласности и Белорусской ассоциации журналистов, куда, как отмечает автор "Белорусской нивы", "потоком льются доллары с Запада".

15 ИЮНЬ

В Белорусскую ассоциацию журналистов поступило письмо от учредителя независимой газеты "Лад" Юрия Карпова, где сообщалось, что редакция получила отказ из Управления юстиции Витебского облисполкома на обращение о предоставлении судом Железнодорожного района г.Витебска информации, которая касается активного участника правозащитного движения Юрия Мороза. Как стало известно, по решению суда он был объявлен в розыск.

Управление юстиции мотивировало свой отказ ссылкой на статью 64 Закона "О судоустройстве и статусе судей в Республике Беларусь". Эта статья запрещает воздействие на судей с целью воспрепятствования всестороннему и объективному рассмотрению дел. Однако редакционные вопросы регулируются ст. 34 Конституции Республики Беларусь, которая закрепляет право граждан на получение, хранение и распространение информации, в том числе о деятельности государственных органов. Эта статья обязывает государственные органы и их должностных лиц предоставить гражданину Республики Беларусь возможность знакомиться с материалами, затрагивающими его права и законные интересы.

Закон "О печати и других средствах массовой информации" (ст.32) закрепляет право на получение информации как в отношении граждан, так и в отношении редакций газет.

Получается, что государство обещает гражданам свободный доступ к информации, а отдельно взятый судья может это положение просто проигнорировать.

JUNE 10

Baranovichi-based newspaper "Step" (Brest region) published several promotion materials ordered by local entrepreneurs. A few days later all advertisers were paid visits by tax inspectors and economic crime investigation officers who scrutinized all commercial activities of the companies. The entrepreneurs preferred to advise the paper's editor Mr. Lobkov that they would not advertise in the paper any longer. Earlier, similar methods were used by Internal Affairs officers in respect of advertisers cooperating with various independent publications, e.g. "Pagonya" and "Information Exchange" from Grodno, "Tydnevik Magiliouski" from Mogilev, "Vitebsk Courier", and others.

JUNE 11

The state newspaper "Belaruskaya Niva" through one of its reporters, Mr. Stepanenko, formerly the Communist Party "Pravda" newspaper correspondent, published a series of libeling articles about a joint project by Russian Glasnost' Protection Fund and the Belarussian Association of Journalists. Under this project, three groups of press-people from Russian regions visited Belarus to get familiar with political, economic and social situation in the country. After the visit they released a number of materials on Belarus.

Commenting on these materials Mr. Stepanenko assumed the role of an arbitrator and generated a row of rude remarks towards Russian reporters. A downpour of defamation also covered the Russian Glasnost' Protection Fund and the Belarussian Association of Journalists which, according to the author, "are washed with American dollars from the West".

JUNE 15

Belarussian Association of Journalists received a letter from one of the founders of the independent "Lad" (Accord) neswpaper Mr. Karpov. The author complained that his paper was denied access to court materials about a prominent human rights advocate Yuri Moroz. Upon the case hearing, Mr. Moroz was entered on a wanted file. As officials from the Department of Justice of Vitebsk Regional Executive Committee informed the paper, their decision to withhold information was based on Article 64 of the Republic of Belarus' Law on Court Procedures and the Judicial Authority, whereby any influence on the judge that hampers thorough and impartial case investigation should be rendered illegal. However, the media access to court materials is regulated by Article 34 of the Republic of Belarus' Constitution, endorsing the public rights to seek, receive and impart information, including that on official organizations. This Article makes it incumbent upon all state officials and organizations to provide citizens of Belarus with all materials relevant to their rights and lawful interests. Article 32 of the Law on Press extends these rights onto newspaper publishers.

The above clearly shows that what is granted by the Constitution and the state in Belarus, e.g. the freedom to receive and impart information, can be easily lost to a local judge.

24 ИЮНЬ

Гомельское областное телерадиообъединение, входящее в структуру Национальной гостелерадиокомпании Беларуси, самовольно отключило от сети вещания городское радио. Вместо выпуска местных новостей и специального тематического блока удивленные горожане прослушали внеплановую музыкальную передачу, подготовленную областным телерадиообъединением.

Как считает главный редактор городского радио Дмитрий Балахонов, случившееся нельзя считать просто недоразумением или профессиональной бестактностью. Самоуправство чиновников нанесло моральный и материальный ущерб имиджу редакции, ведь был сорван график выполнения договорных обязательств перед рекламодателями.

После инцидента председатель областного телерадиообъединения Виктор Маючий принес журналистам устные извинения, посчитав, что этого достаточно.

30 ИЮНЬ

Нижняя палата Национального Собрания Республики Беларусь приняла в первом чтении поправки к ряду Законов. В том числе — о партиях, общественных организациях, профсоюзах, о религиозных объединениях, о печати... Суть поправок в том, что отныне вводится так называемый разрешительный принцип существования общественных организаций, политических партий и движений. В отличие от регистрационного принципа, который существовал ранее.

В соответствии с этими поправками организация должна быть обязательно зарегистрирована. В противном случае на нее накладывается штраф в размере до 30 минимальных зарплат. Если же она не регистрируется на протяжении года, штраф возрастает от 50 до 100 минимальных зарплат. Вплоть до административного ареста руководителя организации на срок до 15 суток.

Кроме того, парламентарии собираются запретить использование в названиях и символике партий и движений слова "народный" и "национальный".

JUNE 24

The Gomel regional TeleRadio Company working under the state-controlled National TV Comapny of Belarus switched off Gomel city radio broadcasts. Instead of local news and other planned programs, dumbfounded citizens listened to an "extraordinary" music program, prepared by the Regional TeleRadio Company. According to the city radio's chief producer Mr. Balakhonov, the incident was not a mere professional blunder. The arbitrariness of the state officials caused moral and material damage as all production schedules were disrupted and agreements with advertisers broken.

After the incident, the Head of the regional TeleRadio Company Mr. Majuchi reckoned it sufficient to offer a verbal apology to radio-journalists.

JUNE 30

The Lower Chamber of the National Assembly of the Republic of Belarus passed in the first reading several amendments to a range of Laws including Laws on Political Parties, Trade Unions, Religious Organizations and the Press. In summary, these amendments are aimed at establishing the legal framework whereby such organizations exist by permission from the authorities, rather than simply by registration, as it had been before.

The amendments stipulate that all organizations are bound to register, otherwise they are subject to fines up to 30 minimal wages. Unless registered during the first year, the fines increase from 50 to 100 minimal wages. Apart from that, the words "national" and "peoples'" are going to be banned from use in the names, titles and symbols representing such organizations. In the same manner, the words "Republic of Belarus" and "Belarus"

Вайна супраць СМІ

Ранее в этих же целях было запрещено использовать слова "Республика Беларусь" и "Беларусь".

Депутаты проголосовали так же за изменения в ст. 5 Закона Республики Беларусь "О печати и других средствах массовой информации". Теперь СМИ не имеют права распространять информацию о незарегистрированных партиях, движениях и общественных организациях. В случае нарушения этого требования средству массовой информации может быть вынесено официальное предупреждение либо его деятельность приостанавливается на срок до 3 месяцев. Если же такие действия повторятся в течение года, то возможно прекращение деятельности СМИ в судебном порядке.

30 ИЮНЬ

ЗАО "Биржи и банки. Белорусская деловая газета" выиграла процесс в Высшем хозяйственном суде. Вынесенное довольно популярному в стране изданию предупреждение Госкомпечати было признано недействительным. Эта информация появилась в "БДГ" под рубрикой "Победа", что полностью соответствует логическому завершению довольно продолжительного судебного разбирательства, в котором самое непосредственное участие на стороное независимого издания принимали эксперты Центра правовой защиты СМИ при Белорусской ассоциации журналистов.

Если вспомнить недавнюю историю, то в предупреждении Госкомпечати, датированном 22 апреля, говорилось: "В соответствии с заключением Министерства юстиции Республики Беларусь материалы, опубликованные в газете "Биржи и банки. Белорусская деловая газета"... под рубриками "Мониторинг законодательства" и "Правовое обозрение", являются правовой информацией... Распространение правовой информации без получения соответствующей лицензии является нарушением законодательства".

Однако независимые журналисты опротестовали это предупреждение и доказали, что публикуемые в "БДГ" материалы не являются точным воспроизведением "текстов актов, входящих в структуру законодательства", как говорится в Положении о выдаче лицензий на распространение правовой информации. Более того, как отметил отдел информации "БДГ" в одной из статей, "...в ходе судебного процесса выяснилась одна интересная подробность. На самом деле Минюст не делал никакого заключения по поводу публикаций в правовом обозрении "БДГ". Мысль о "безлицензионном" распространении нами правовой информации представители Минюста всего лишь высказывали в письме, адресованном Госкомпечати, однако этот документ относится к служебной переписке и является не заключением, а просто мнением представителей Минюста. Этот факт они признали в ходе судебного процесса.

"Белорусской деповой газете" удалось доказать, что обзоры законодательства, опубликованные в "Правовом обозрении", являются авторскими произведениями, и поэтому суд признал правомерность их распространения".

War against MEDIA

had already been banned from such use.

Peoples' Deputies also voted for amendments to Article 5 of the Republic of Belarus' Law on Press and other Mass Media. From that date, mass media can not distribute information about organizations, parties and movements that have not registered. In case of a breach of this requirement any media will be officially warned or suspended for a period of up to 3 months. Recurrent cases of incompliance may result in a court case and license termination.

JUNE 30

The joint company "Stock Brokers and Banks. Belarussian Business Paper" won a process in the Supreme Economic Court of Belarus. The official warning issued to this popular publication was deemed invalid. This news was published in the paper under the heading "Victory!", which is very much in line with the ultimate termination of the rather lengthy case. The victory can to a great extent be attributed to the newspapers advocates – experts of the Center for Media Support under the Belarussian Association of Journalists.

One should remember the pretext for bringing the suit against Belarussian Business – the warning by the State Committee on Press which read: "According to the Ministry of Justice Decision... the materials made public by the "Stock Brokers and Banks. Belarussian Business Paper" under the headings "Legislation Monitoring" and "Legal Overview" constitute official information... Distribution of such official information without appropriate license is in breach of the legislation".

Nonetheless, independent journalists lodged a protest against the official warning and proved that the published materials "were not exact copies of the concerned legislative acts". Moreover, as noted by the information department of the Belarussian Business Paper, "an interesting detail emerged during the process. Actually, the Ministry of Justice did not take a decision on account of the "legal overview" publications. The very idea of unlawful dissemination of legal information was proposed in a letter from the Ministry of Justice to the State Committee on Press. However, such letter merely expressed opinion of the Ministry of Justice and could not qualify as official decision. This fact was also acknowledged during the court hearing. "The Belarussian Business Paper succeeded in proving that "legal overviews" express opinions of their authors and, therefore, can be freely disseminated".

Ольга Алексеева

Белорусские СМИ: Политика или информация?

"Повышение эффективности деятельности СМИ в Республике Беларусь" – так назывался прошедший 15 июня в Минска семинар, который был организован Белорусской ассоциацией журналистов (БАЖ) и Всемирным институтом свободной прессы из Калифорнии (WFPI). В нем участвовали в основном представители региональных белорусских изданий. Участники семинара и докладчики из США и Беларуси обменялись мнениями по поводу проблем белорусских СМИ. Спектр затронутых тем был обширным, начиная с газетного менеджмента, методов повышения потребительского спроса на прессу и заканчивая свежими данными о доверии читателей к белорусским масс-медиа, которые обнародовал руководитель социологической лаборатории "НОВАК" Андрей Вардмацкий. Открывая семинар, президент WFPI Клэй Хасвэл, сославшись на статью 19 Всемирной декларации прав человека, напомнил, что каждый человек, гражданин любой страны имеет право на свободное выражение своего личного отношения к той или иной проблеме – неважно, каким способом: при помощи газетной статьи, письма, песни. Мистер Хасвэл отметил, что условия деятельности американской прессы в корне отличаются от ситуации с белорусскими СМИ. В США масс-медиа независимы, "служат читателю, а не государству". Редактор и основатель первой независимой ежедневной газеты в Словакии "Национальное возрождение" Татьяна Репкова говорила о важности достоверности информации. Прежде всего факты, а не эмоции привлекают внимание читателей. Спрос на газету возрастает, растет тираж, а вместе с ними и количество рекламодателей. Богатая газета качественно всегда выигрывает по сравнению с газетой бедной, она может больше платить журналистам и, следовательно, привлечь высококвалифицированных сотрудников. Выражать свое мнение журналист имеет право только в комментариях, а подача информации должна быть беспристрастной. Но и комментарий, по мнению словацкой издательницы, должен быть основан на фактах, их логическом и рациональном анализе, а не на "собственном убеждении".



Брест. Занятия проводит эксперт Всемирного Института Свободной прессы (Калифорния) Татьяна Репникова

Известный белорусский лингвист, бывший Чрезвычайный и Полномочный посол Республики Беларусь в Германии Петр Садовский упрекнул белорусскую прессу, как государственную, так и независимую, в необъективности. По его мнению, многие белорусские журналы не анализируют ситуацию, а "клеят ярлыки". В газетах нередко публикуется непроверенная и конъюктурная информация. Налицо "черно-белая", без полутонов, семантика большинства белорусских газет. С одной стороны – "Славянский набат", который печатает "махровую, черносотенную информацию". С другой – негосударственные СМИ, которые в большинстве своем политизированы и нередко тиражируют одну и туже информацию. Послушав радио "Свобода", газет можно вообще не читать, они лишь повторяют информацию. Петр Садовский упрекнул отечественных журналистов в недостатке знаний в области филологии, истории, литературы и даже журналистики. Газеты цитируют (либо попросту повторяют) высказывания политиков, не замечая их совершенной безграмотности. Так, в одном официальном издании были напечатаны слова спикера нижней палаты белорусского парламента Малофеева: "Этот вопрос нельзя лоббировать. Лобовая атака здесь не пойдет".

Эд Джонсон



Снижение уровня доверия в целом к белорусским средствам массовой информации констатировал социолог Андрей Вардомацкий. "Большинство респондентов считает, что высказыва-

Рейтинг негосударственных СМИ высок лишь в Минске, и опрос "НОВАКа" показал, что по уровню популярности в белорусской столице они стоят на втором месте после православной церкви. Независимая пресса у большинства людей ассоциируется с оппозицией.

Кульминационным моментом семинара стала игра. Участвующие в ней журналисты должны были ответить на вопрос, что должно быть первичным в освещении избирательной кампании: политическая целесообразность и программные положения кандидата или беспристрастность и объективность, которые могут повредить демократическому кандидату. Большинство журналистов сошлись во мнении, что в условиях Беларуси не действуют принятые во всем мире принципы журналистики. Главная цель – объединить свои силы в борьбе за демократию.



Будущее за ними (газета "Биржа информации")



Семинар в Гродно



Слева на право: Эд Джонсон консультант Всемирного института свободной прессы, руководитель образовательного проекта Программы Развития ООН Сергей Комлач, зам.гл.редактора газеты "Биржа информации" Михаил Карневич (Гродно)



ВСТРЕЧА С "АКУЛАМИ ПЕРА"

Белорусская ассоциация журналистов и Всемирный институт свободной прессы (США, Калифорния) провели в Бресте семинар для журналистов на тему: "Повышение эффективности деятельности средств массовой информации в Республике Беларусь".

О различных аспектах газетного менеджмента поведали собравшимся "акулы" газетного бизнеса из далекого Сан-Франциско Эд Джонсон и Клей Хасвелл. В их выступлениях поражали высочайшая компетентность, доброжелательность, достоинство и скромность. Речь шла о методах работы журналистов, мотивации их труда, журналистской этике, финансовых проблемах. Татьяна Репкова – тоже сотрудница института из Сан-Франциско (родом она из Словакии, бывший редактор национальной независимой газеты "Национальное возрождение"). Она рассказала о роли прессы в мирном переходе от диктатуры к демократии в Словакии (на осенних парламентских выборах победили правые, потерпел поражение бывший премьер-министр Мечьяр). Александр Томкович (зам.гл.редактора газеты "Свободные новости") раскрыл многие аспекты деятельности СМИ в освещании предвыборных кампаний, где проявились и высокий класс нашей журналистики, и ее убожество, конформизм.



Газета "ТВ-вид" г. Речица

Были на семинаре и практические занятия, вылившиеся в жаркую дискуссию, но и здесь в конечном итоге побеждали доброжелательность и уважение точки зрения оппонента. Запомнилась глубокая мысль Эда Джонсона (он начинал с продавца газет, а заканчивал карьеру редактором региональной сети крупнейшей американской газеты "Нью-Йорк таймс"): "Зарплата журналиста – не самое большое вознаграждение. Должно быть удовлетворение от работы и осознание служения высокой цели". Семинар прошел на базе популярной газеты "Брестский курьер", а вел его главный редактор этой газеты Николай Александров.

Виктор Филатов, "Информ-прогулка" (№8 (32) 1999)



Газета "Мозырская неделя"

СПОСОБЫ ПОЛУЧЕНИЯ И ОЦЕНКИ ИНФОРМАЦИИ

(Конец. Начало в № 3-4)

3. Взятие информации из документов

Нужную фактуру, обретаемую в некоторых документах, можно получить, либо получив сам оригинал или его копию, либо ознакомившись с его содержанием по отдельным достоверным свидетельствам.

А. Обретение доступа к документам

В ходе добывания необходимых документов принято использовать такие приемы, как:

- тайное проникновение в место хранения носителя (по возможности не оставляя никаких следов либо вынужденно имитируя заурядную кражу);
- "распечатывание" места хранения созданием или имитацией аварийного (пожар, затопление...) состояния с прониканием туда под видом спасателей;
- кратковременный захват нужного помещения;
- перехват (кража, вымогательство, разбой, подкуп...) документа в ходе его пересылки или передачи (техника осуществления перехвата в сущности зависит от используемого для акции звена на пути перемещения носителя, пересылка каковoго может быть как плановой, так и инспирированной);
- подключение третьих лиц (контактеров или профессионалов), заинтересовав их в доставлении вам (а возможно, что и в добывании для себя) некоего документа;
- мощное давление (шантаж, подкуп...) на человека, обладающего доступом к носителю информации либо к месту его хранения;
- требование документа или его копии с правдоподобным обоснованием - совместное дело, социальная безопасность, ведомственный контроль... - нужности сего для его хранителей.

Чтобы несколько сбить с толку как владельца, так и добывателя документа, требуемую фактуру не мешает изымать вместе с бесполезными носителями.

Скрытное копирование - ксерографию, фотосъемку... - должно применять, если:

- важно скрыть тот факт, что вполне определенный документ явно заинтересовал кого-то и теперь оказался у других;
- надо обезопасить поставщика или метод получения доступа к носителю;
- важно только содержание, а не сам оригинал.

Если вас интересует только содержание документа или же сам факт его существования, можно удовлетвориться "ментальным копированием", попросту запоминая фактуру носителя, а затем фиксируя ее на бумаге. Характерными приемами при этом являются:

- официальный визит вашего агента, выдающего себя за представителя некоей общественной, коммерческой или государственной службы (медика, рекламного агента, социолога, коммерсанта, журналиста...) с правомочной просьбой о просматривании тех бумаг, среди которых содержится нужный вам документ;
- подключение сотрудников и контактеров объекта (что используемо лишь тогда, когда у них отличная память и нет видимых причин "заложить" вас или переврать то, что они могли увидеть).

Б. Перехват и перлюстрация писем

Завладеть чужим почтовым отправлением - письмом, бандеролью, посылкой - можно:

- у отправителя (кража посредством контактеров или профессионалов, грубое разбойное нападение, изымание почты из ящика при оперативном визуальном наблюдении за объектом, разнотипные изъятия в почтовом отделении...);
- в пути (перехват либо подкуп курьера, силовой захват или угон почтовой автомашины...);
- у получателя (в местном отделении связи, путем подкупа почтальона; из почтового ящика, в ходе его постоянного просматривания; в доме у адресата, через его контактера...).

При скрытом извлечении информации из обычных запечатанных писем (т.е. перлюстрации их) применяются такие приемы, как:

- мощное просвечивание и фотографирование письма без вскрывания конверта (чтобы читать полученные таким образом копии, нужен некоторый навык, ибо строки выявляются частично перевернутыми и наложенными друг на друга);
- временное (секунд на 30) опрозрачивание конверта при обрызгивании его специальным спреем (РК 705, 1А-4...);
- грубое вскрытие с последующей заменой поврежденного конверта и с фабрикацией имеющихся на оригинале печатей и надписей;
- ловкое вытягивание навернутого на костяную спицу письма через маленькую щель в углу конверта;
- осторожное вскрытие и предельно осмотрительное запечатывание послания.

Нежное вскрывание конвертов издавна осуществляют с помощью изящных костяных инструментов и обычного водяного пара. В данном случае лучше употреблять плоскую подогреваемую снизу поверхность, на которой размещают увлажненную промокательную бумагу, выделяющую при последующем нагреве размягчающий клей пар. Поверх всего этого и кладут вскрываемое письмо.

В параллельном варианте увлажненные полоски промокательной бумаги или поролона возлагают только на заклеенные поверхности, а для создания пара прибегают к помощи обычного утюга. Проще всего, впрочем, воспользоваться струей пара, исходящего из носика кипящего чайника.

Если подозревается, что отправитель употребил невидимые чернила, извлеченное послание тщательно размещают между двумя подвергшимися обработке горячим паром листками бумаги и водворяют данный "бутерброд" под пресс с тем, чтобы часть задействованной "химии" перенеслась на копии-подложки, с которыми можно работать для выявления тайнописи. Оригинал при этом внешне не меняется.

Сняв информацию и скопировав письмо, конверт тщательно запечатывают при помощи мягких ватных тампонов и прозрачного (но не силикатного!) клея.

В. Обработка "мусора"

К "мусору" обычно относят различные пометки на использованных сигаретных пачках и обрывках газет, смятые и разорванные бумаги, текст на коих может быть зачеркнут или же залит красителями, разнотипные листки, ненароком оказавшиеся (или специально помещенные...) под носителями при записях на оригиналах, отработанные "копирки", листинги и катушки старых лент от пишущих машинок...

Так как на банальный "мусор" редко обращают пристальное внимание, изымание его почти не замечается и осуществляется значительно проще, причем как из закрытого помещения (визитером, сервисным ремонтником, уборщицей, сотрудником...), так и вне такового (на мусорной свалке...). Для чтения обнаруженных таким образом материалов применяют нижеследующие приемы:

Восстановление разорванных документов:

- распрямите и разгладьте все разорванные клочки бумаги;
- тщательно рассортируйте их по цвету и типу носителя, по окраске штрихов и по способу письма;
- отберите разные обрывки с ровными краями и, удобно разместив по углам те, что имеют угловые обрезы, выложите из них рамку;
- аккуратно заполните образовавшееся пространство подходящими частями, ориентируясь по линиям сгиба и разрыва, положению штрихов и содержанию текста...

Всю эту работу хорошо бы выполнять на куске стекла, а приемлемо восстановив документ, бережно прижать его другим стеклом и зафиксировать скотчем.

Выявление вдавленных следов на подложках:

- разместите документ так, чтобы высвечивающий пучок света оказался сбоку, перпендикулярно основным направлениям вдавленных штрихов и под острым углом к фоновой поверхности подложки. Текст при этом можно просто прочитать, а при необходимости и сфотографировать.

В параллельном варианте применяют медицинский порошок железа, восстановленного водородом, и "магнитную кисть". Порошок обычно высыпают на исследуемую поверхность и перемещают вдоль нее с помощью магнита, тогда после удаления излишков железа текст становится видимым.

Способы чтения зачеркнутых и залитых текстов:

- осмотрите документ при боковом освещении с лицевой и оборотной стороны (это целесообразно, если штрихи текста имеют некоторый рельеф);
- осмотрите документ на просвет (это действенно, когда краситель штрихов текста резко контрастирует с красителем пятна);
- осмотрите документ в отраженном или проходящем свете, применяя светофильтр того же цвета, что и цвет пятна (это сработает, если штрихи текста и пятно разного цвета);
- попытайтесь удалить или ослабить верхний слой красителя, хорошо прижав к нему на короткое время некую откопировывающую - сырой каучук, влажную эмульсию фотопленки... - поверхность (это помогает, если текст пытались зачеркнуть графитным карандашом);
- обработайте все перемаранные участки подходящим растворителем (ацетоном, бензиловым спиртом, эфиром) красителя (это перспективно, если машинописный текст под копирку перечеркнут черной пастой шариковых ручек).

Восстановление текста по копировальной бумаге:

- поместите старую копирку на стекло и прочтите (или сфотографируйте) текст на просвет;
- если буквы на копирке плохо различимы, примените боковое освещение, падающее на лист под острым углом;
- если копиркой пользовались неоднократно, сделайте с нее фото- или ксерокопию и закрасьте черным фетровым фломастером или мягкой тонкой кистью белые штрихи всех записей, явно не относящиеся ввиду их расположения к интересующему вас тексту.

4. Принципы оценки и анализа информации

Полученные разнообразными путями данные станут полезными лишь после того, как все они подвергнутся необходимому анализу и предельно точному истолкованию. Подоплека многих деловых неудач заключается не в игнорировании информации, а в ее ошибочном анализе.

Сведения, как правило, оцениваются по достоверности, значимости, согласованности, полноте, возможности использования.

А. Достоверность и надежность материалов

Любая поступающая извне информация характеризуется определенной степенью достоверности, в частности зависящей от степени надежности источника и того, откуда он ее получил.

Чтобы высветить такие показатели, каждый регистрируемый факт полезно дополнять специальной буквенно-цифровой отметкой, причем буквами обозначают уровень надежности источника, а цифрами - откуда тот взял сведения.

Уровень надежности источника принято кодировать так:

А - абсолютно надежный и компетентный;
Б - обычно надежный;
В - не слишком надежный;
Г - ненадежный;
Д - неопределенный.

То, как этот источник получил представляемые данные, отмечают следующим образом:

1 - сам видел;
2 - слышал от того, кому можно верить;
3 - слухи.

Никогда не стоит забывать, что не вызывающий сомнений источник (А) иной раз способен передать явную дезинформацию, а совершенно ненадежный тип (Г) - сообщить ценнейшие данные. Памятуя об этом, двухзначковый индекс иногда дополняется римской цифрой, указующей на предполагаемую достоверность факта:

1 - подтверждается другими фактами;
П - вероятно правдив (3 к 1);
Ш - возможно правдив (1 к 1);
1У - сомнителен (3 против 1);
У - неправдоподобен;
У1 - неопределяем.

Маркировка Ш-Б2, к примеру, означает, что фактура предоставлена довольно надежным информатором (Б) со слов знающего человека (2) и возможно - "50 на 50" - правдива (Ш).

При наличии каких-либо сомнений в достоверности дошедших до вас данных, их полезно отложить про запас в ожидании других подтверждающих или опровергающих фактов.

Б. Искажение информации и дезинформация

Следует учитывать, что поступающая к вам фактура может быть:

- подсунута источнику как дезинформация;
- искажена им преднамеренно;
- изменена - произвольно или непроизвольно - в ходе ее передачи.

Устные сообщения, циркулирующие по горизонтальным и неформальным каналам, менее подвержены искажениям, а вот информация, поставляемая наверх, чаще приукрашивается (ввиду явного желания угодить, получить вознаграждение, избежать наказания...), чем наоборот.

При намеренной дезинформации применяют как заведомую ложь, так и уточненную полуправду, исподволь подталкивающую воспринимающих к ложным суждениям. Наиболее распространенными приемами здесь являются:

- прямое сокрытие фактов;
- тенденциозный подбор данных;
- нарушение логических и временных связей между событиями;
- подача правды в таком контексте (добавлением ложного факта или намека...), чтобы она воспринималась как ложь;
- изложение важнейших данных на ярком фоне отвлекающих внимание сведений;
- смешивание разнородных мнений и фактов;
- сообщение информации такими словами, которые можно истолковывать по-разному;
- неупоминание ключевых деталей факта.

Искажения, возникающие в процессе ретрансляции исходных данных, чаще всего происходят из-за:

- передачи только части сообщения;
- пересказа услышанного своими словами ("испорченный телефон");
- пропуска фактуры через призму субъективно-личностных отношений.

Для успешной борьбы с вероятной дезинформацией следует:

- различать факты и мнения;
- понимать, способен ли информатор по своему положению иметь доступ к сообщаемым фактам;
- учитывать субъективные (самомнение, фантазийность...) характеристики источника и его предполагаемое отношение к выдаваемому сообщению;
- применять дублирующие каналы информации;
- исключать все лишние промежуточные звенья;
- помнить, что особенно легко воспринимается та дезинформация, которую вы предполагаете или желаете услышать.

В. Техника интерпретации данных

Польза от наличествующих материалов резко возрастает, если прояснены их значения; истина обычно раскрывается не в исходных данных, а в их точном истолковании, ибо конкретный факт можно уяснить лишь в сочетании с другими фактами.

Переработка информации после предварительного собирания фактуры и конкретной постановки проблемы подразумевает:

а) систематизацию фактов, которые сортируют по степени их отношения к тому или иному вопросу;

б) выявление, основываясь на интуиции, ключевых моментов;

в) построение предположений, объясняющих основные факты;

г) получение, при необходимости, дополнительных данных;

д) оформление выводов и их проверка на соответствие другим фактам.

На отдельные вопросы часто удается получить прямой и вполне определенный ответ, а в отношении других вынужденно ограничиваются одними предположениями.

Надо интуитивно понимать, каковые из моментов являются важнейшими, а не концентрировать внимание сразу на многих, что способно заблокировать работу человеческого мозга.

Иной раз полезно прокрутить полученную информацию среди лиц, имеющих к ней некоторое отношение, полагая, что они помогут выявить какие-либо связи с некоей побочной информацией.

Высказав определенное предположение, его тщательно проверяют на стыкуемость со всеми данными, и когда здесь обнаружится значительная неувязка, а факты явно правдивы, - требуется изменить суждение.

Ложная интерпретация фактуры вероятна, если:

- представлены не все материалы,
- некоторые из имеющихся под рукой фактов сомнительны,
- все внимание сосредотачивается лишь на тех сообщениях, кои подтверждают ожидания и предположения аналитика.

Чтобы выявить возможные пути развития исходной ситуации, надо очень четко представлять:

- ключевых персон противника;
- то, к чему он в сущности стремится (как по максимуму, так и по минимуму);
- есть ли некая система в его действиях;
- чего в них больше: логики, эмоций, традиций или случайностей;
- существует ли такой союзник, с которым противник не порвет;
- явные границы допустимости в его деяниях;
- уязвимые места противника;
- то, как он оценивает ситуацию;
- вероятные реакции на действия с каждой стороны.

В некоторых случаях перспективно идти не от фактов к построению гипотезы, а от выдвигаемой гипотезы к имеющимся фактам. Так, отлично зная ключевое лицо противника, мысленно поставьте себя на его место и прикиньте, что за "хитрую" игру он мог бы вести. Исходя из этого выведите ряд предположений о его намерениях и определите действия, должные последовать при каждом из них. Сопоставив мысленные ситуации и наличные реалии, отберите ту гипотезу, каковая соответствует большинству имеющихся фактов.

Оптимальную помощь в обработке всей подобной информации может оказать любая простенькая ЭВМ, не страдающая субъективностью и ограниченностью ума человека.

Подготовил Игорь Кузнецов

От редакции: эти рекомендации рассчитаны на думающего человека. Далеко не всеми из них следует пользоваться, но следует знать, как "это" делается...

ПАЛАЖЭННЕ

БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ЖУРНАЛІСТАЎ АБ КАМІСІІ ПА ЭТЫЦЫ

(са зmяненнямі і дапаўненнямі)

1. Агульныя палажэнні

1.1. Камісія па этыцы (у далейшым — Камісія) з'яўляецца выбарным органам Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ) у адпаведнасці з пунктам 4.27 Статута БАЖ.

1.2. У сваёй дзейнасці Камісія па этыцы кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Статутам БАЖ і дадзеным Палажэннем.

1.3. У Камісію па этыцы ўваходзяць прэзідэнт БАЖ па пасадзе (ён жа – старшыня Камісіі) і чатыры сябры БАЖ, абіраныя на З'ездзе. Прадстаўнікі кіруючых органаў БАЖ, акрамя прэзідэнта БАЖ, не могуць уваходзіць у склад Камісіі па этыцы. Камісія абірае са свайго складу намесніка старшыні і сакратара, які вядзе маніторынг публікацый, тэле- і радыёматэрыялаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца сябры БАЖ (фізічныя і калектыўныя), а таксама іх грамадскіх учынкаў, рыхтуе паседжанні Камісіі, разгляд спраў, вядзе справаводства.

1.4. Камісія разглядае справы па фактах парушэнняў журналістамі (сябрамі БАЖ) Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі беларускага журналіста і сродкаў масавай інфармацыі, якая зацведжана рашэннем 2-га З'езда БАЖ ад 20 снежня 1997 года (прыкладаецца). Паседжанні Камісіі праводзяцца не радзей як раз у тры месяцы.

1.5. Правам звяртацца ў Камісію з адпаведнымі заявамі валодаюць органы дзяржаўнага кіравання, філіі БАЖ, рэдакцыі газет, любы сябра БАЖ, а таксама зацікаўленыя грамадзяне. Камісія можа сама ініцыіраваць разгляд справы.

1.6. Камісія разглядае справы па фактах, якія адбыліся ў час яе дзейнасці.

2. Парадак разгляду спраў

2.1. Справа прымаецца да разгляду пасля адпаведнай заявы ў вольнай форме на імя старшыні Камісіі за выключэннем выпадкаў, калі справа разглядаецца Камісіяй па ўласнай ініцыятыве.

2.2. Старшыня Камісіі даручае не менш чым двум сябрам Камісіі, удакладніць факты і сабраць неабходныя дакументы. Тэрмін разгляду справы не можа перавышаць аднаго месяца, а ў асобных выпадках – двух месяцаў.

2.3. Пасля вывучэння фактаў прызначаецца паседжанне Камісіі. Паседжанне Камісіі адбываецца пры наяўнасці не менш трох сяброў Камісіі. На паседжанне Камісіі запрашаюцца прадстаўнікі абодвух бакоў – тых, хто вінаваціць і каго вінавацяць. Пры ігнараванні запрашэння Камісіі прадстаўнікамі таго ці іншага боку справа можа разглядацца пры іх адсутнасці.

На паседжанні Камісіі дапускаецца прысутнасць сяброў Рады і Праўлення БАЖ, а таксама зацікаўленых асоб.

Рашэнне Камісіі прымаецца пасля выслухоўвання абодвух бакоў, вывучэння і абмеркавання ўсіх абмеркаванняў справы. Прысутныя на пасяджэнні Камісіі сябры Рады і Праўлення БАЖ, а таксама іншыя зацікаўленыя асобы маюць права выступіць дзеля тлумачэння акалічнасцяў справы.

2.4. У выніку разгляду справы Камісія можа прыняць адно з наступных рашэнняў:

— прызнаць, што сябра БАЖ не з'яўляецца парушэнем Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі беларускага журналіста і сродкаў масавай інфармацыі;

— прызнаць сябра БАЖ парушальнікам Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі беларускага журналіста і сродкаў масавай інфармацыі.

У звязку з апошнім Камісія мае права абмежавацца абмеркаваннем справы альбо рэкамендаваць Радзе БАЖ:

— абвясціць парушальніку грамадскае ганьбаванне;

— выключыць парушальніка са складу БАЖ;

— інфармаваць у асобных выпадках праз сродкі масавай інфармацыі (альбо іншым шляхам) грамадскасць аб дзеяннях парушальніка Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі беларускага журналіста і сродкаў масавай інфармацыі, акалічнасцях справы і прынятым рашэнні.

2.5. Рашэнні Каміссіі прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў ад агульнага складу.

2.6. Прынятае рашэнне Камісіі выкладаецца ў пісьмовым выглядзе, павінна змяшчаць кароткае абгрунтаванне рашэння і падпісваецца ўсімі прысутнымі сябрамі Камісіі.

Сябра Камісіі, які не згодны з прынятым рашэннем, мае права выкласці ў пісьмовым выглядзе сваё асабістае меркаванне.

2.7. Копія рашэння Камісіі выдаецца непасрэдна бакам, якія ўдзельнічалі ў разглядзе справы.

3. Абскарджанне рашэння Камісіі

3.1. Кожны з бакоў мае права абскардзіць рашэнне Камісіі ў Радзе БАЖ на працягу двух тыдняў.

3.2. Для абскарджання падаецца заява на імя прэзідэнта БАЖ, копія рашэння Камісіі і іншыя матэрыялы, якія тычацца сутнасці скаргі.

3.3. Рада БАЖ абавязана разгледзець скаргу на бліжэйшым чарговым паседжанні. Пры разглядзе скаргі на паседжанне Рады запрашаюцца сябры Камісіі і прадстаўнікі бакоў, якія маюць права аднаго выступу. Прысутнасць старшыні Камісіі ці яго намесніка, ці ўпаўнаважанага сябра Камісіі, а таксама боку, які падаў скаргу, пры яе разглядзе на Радзе БАЖ абвязковая.

3.4. Пры разглядзе скаргі Рада БАЖ можа пакінуць у сіле рашэнне Камісіі ці яго адмяніць.

3.5. Рашэнне Рады БАЖ па выніках разгляду можа быць абскарджана на чарговым З'ездзе БАЖ.

3.6. Рашэнне З'езда БАЖ па дадзеным пытанні з'яўляецца канчатковым.

ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРЫНЦЫПАЎ ПРАФЕСІЙНАЙ ЭТЫКІ БЕЛАРУСКІХ ЖУРНАЛІСТАЎ І СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Зыходзячы з вышэйшых маральных арыенціраў прафесійнай дзейнасці, з намеру ўмацоўваць давер грамадства да прэсы, як да аднаго з найбольш важных дэмакратычных інстытутаў;

Прызнаючы прыярытэт міжнародных прававых і этычных норм у галіне СМІ;

Разумеючы, што свабодная журналістыка патрабуе пэўных маральных самаабмежаванняў, Беларуская асацыяцыя журналістаў рэкамендуе сваім сябрам добраахвотна прытрымлівацца наступных прынцыпаў прафесійнай этыкі:

1. **АДСТОЙВАЦЬ** права на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі ўсімі законнымі сродкамі незалежна ад дзяржаўных межаў.

2. **ПРАЯЎЛЯЦЬ** публічную салідарнасць з усімі, хто падвяргаецца ўціску і рэпрэсіям за сваю прафесійную дзейнасць.

3. **КІРАВАЦЦА** ў сваёй дзейнасці выключна інтарэсамі грамадства.

4. **ЛІЧЫЦЬ**, што эгаістычныя, групавыя, вузкапартыйныя інтарэсы несумяшчальныя з прафесійнай дзейнасцю журналіста і СМІ.

5. **ІМКНУЦЦА** да максімальнай дакладнасці інфармацыі, глыбіні і праўдзівасці аргументаў пры выкладанні сваіх поглядаў, пазіцый і меркаванняў.

6. **АБАРАНЯЦЬ** праўду, памятаючы пры гэтым, што ніхто не валодае абсалютным правам на ісціну.

7. **ПАВАЖАЦЬ** іншыя погляды, меркаванні і пазіцыі, калі ў іх адсутнічаюць хлусня, фальш, а самі яны з'яўляюцца вынікам пошуку ісціны.

8. **ГАРАНТАВАЦЬ** свабоднае выяўленне любых поглядаў, пазіцый і думак, калі яны не пераследуюць антыгуманных мэтаў. Прапаганда і апраўданне вайны, дыктатуры ва ўсіх яе праявах, расавай, нацыянальнай, сацыяльнай, рэлігійнай нецярпімасці і варожасці несумяшчальныя з годнасцю журналіста і СМІ.

9. **НЕ ДАГАДЖАЦЬ** тым, хто ва ўладзе, на чым бы іх ўлада ні трымалася. Залежнасць ад іх — загана, якой трэба пазбаўляцца.

10. **ПРЫЗНАВАЦЬ** адкрыта і сумленна свае памылкі.

11. **ЗАХОЎВАЦЬ** прынцып прэзумпцыі невінаватасці ў адносінах да асобаў ці арганізацый, чыя віна можа быць даказана толькі ў судовым парадку.

12. **НЕ ПРЫСВОЙВАЦЬ** сабе права публічнага ўмяшання ў прыватнае жыццё грамадзян, калі на то няма іх згоды, або прыватнае жыццё грамадзян, асабліва палітыкаў і службовых асоб, бо гэта супярэчыць дэмакратычным і маральным нормам грамадскага жыцця. Кожная асоба, якая трапіла пад публічную крытыку, мае права на адказ у тым жа сродку масавай інфармацыі.

13. **ПАЗБЯГАЦЬ** зневажальных, прыніжаючых годнасць чалавека, грамадства і дзяржавы публічных характарыстык.

14. **ПАМЯТАЦЬ**, што праўда — не толькі вышэйшая каштоўнасць для журналіста і СМІ, але і вышэйшая мера адказнасці перад асобай і грамадствам.

Статут Грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя журналістаў"

(у новай рэдакцыі, 1999г.)

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Грамадскае аб'яднанне "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (у далейшым па тэксту ГА "БАЖ") - рэспубліканскае добраахвотнае аб'яднанне грамадзян прафесійнага накірунку, якія займаюцца журналісцкай дзейнасцю або садзейнічаюць яе развіццю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.2. ГА "БАЖ" дзейнічае ў адпаведнасці з дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1999 г. № 2 "Аб некаторых мерах па ўпарадкаванню дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў", Законам "Аб грамадскіх аб'яднаннях", дзеючым заканадаўствам і гэтым Статутам на прынцыпах раўнапраўя сваіх сяброў, самакіравання і галоснасці на тэрыторыі Беларусь.

1.3. ГА "БАЖ" з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны баланс, разліковы і іншыя рахункі ва ўстановах банкаў, пячатку, штампы, бланкі і іншую атрыбутыку. ГА "БАЖ" ад свайго імя заключае дагаворы, набывае маёмасныя, уласныя немаёмасныя правы і нясе абавязкі, уступае ва ўзаемаадносіны з юрыдычнымі асобамі, выступае істцом і адказчыкам у судах.

1.4. ГА "БАЖ" адказвае па сваіх абавязацельствах маёмасцю, на якую паводле дзеючага заканадаўства можа быць накладзена спагнанне. ГА "БАЖ" не нясе адказнасці па абавязацельствах сваіх сяброў, а яны не нясуць адказнасці па абавязацельствах ГА "БАЖ".

1.5. ГА "БАЖ" можа ўступаць у міжнародныя грамадскія аб'яднанні ці ўдзельнічаць у іх стварэнні, падтрымліваць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні, якія не супярэчаць міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

1.6. Поўная назва ГА "БАЖ":
на беларускай мове — Грамадскае аб'яднанне "Беларуская асацыяцыя журналістаў";
на рускай мове — Общественное объединение "Белорусская ассоциация журналистов";
на англійскай мове – Publik organization "Belarusian association of journalists".
Скарочаная назва – ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў".

1.7. Юрыдычны адрас ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў": 220002, г.Мінск, вул. Старажоўская, 8 - 313.

2. АСНОЎНЫЯ МЭТА, ЗАДАЧЫ І МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ГА "БАЖ"

2.1. Асноўнай мэтай дзейнасці ГА "БАЖ" з'яўляецца:

2.1.1. Садзейнічанне рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных, культурных і прафесійных правоў і законных інтарэсаў сяброў арганізацыі, іх творчаму самавыяўленню і росту прафесійнага майстэрства, стварэнне ўмоў для забеспячэння свабоды слова і друку, права на бесперашкоднае атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі.

2.2. Асноўнымі задачамі ГА "БАЖ" з'яўляюцца:

2.2.1. Абарона правоў і законных інтарэсаў журналістаў у дзяржаўных органах і міжнародных арганізацыях.

2.2.2. Садзейнічанне сябрам ГА "БАЖ" у стварэнні матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйных і іншых неабходных умоў для дзейнасці і павышэння прафесійнага ўзроўню.

2.2.3. Распрацоўка цывілізаванай праграмы развіцця СМІ, якая павінна стварыць спрыяльныя ўмовы для іх функцыянавання на Беларусі.

2.2.4. Развіццё адносін з журналісцкімі арганізацыямі іншых краін свету. ГА "БАЖ" можа вырашаць і іншыя задачы, якія вынікаюць з мэты Статута.

2.3. Для выканання статутнай мэты і задач ГА "БАЖ" выкарыстоўвае наступныя метады:

2.3.1. Ажыццяўляе кансультацыйную, навуковую, вучэбную, метадычную, інфармацыйную дзейнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

2.3.2. Займаецца выдавецкай і іншай дзейнасцю, не забароненай заканадаўствам.

2.3.3. Аказвае юрыдычную дапамогу сябрам ГА "БАЖ", прадстаўляе іх інтарэсы у судах і іншых дзяржаўных установах.

2.3.4. Вядзе маніторынг парушэнняў заканадаўства аб СМІ.

2.3.5. Стварае клубы, цэнтры, творчыя майстэрні і іншыя адпаведныя структуры, арганізоўвае канферэнцыі, семінары для журналістаў, а таксама стажыроўкі па абмену вопытам.

2.3.6. Ажыццяўляе кантроль за выкананнем сябрамі ГА "БАЖ" Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі і разглядае скаргі на іх парушэнне.

2.3.7. Заахвочвае сваіх сяброў за дасягненне высокіх паказчыкаў у прафесійнай дзейнасці альбо за прынцыповасць у абароне правоў і законных інтарэсаў сяброў ГА "БАЖ".

2.3.8. Засноўвае згодна з дзеючым заканадаўствам сродкі масавай інфармацыі, распаўсюджвае інфармацыю аб сваёй дзейнасці.

2.3.9. Аказвае дапамогу, у тым ліку тэхнічную, сродкам масавай інфармацыі, у якіх большасць рэдакцыйнага калектыву складаюць сябры ГА "БАЖ".

2.3.10. Для дасягнення статутнай мэты і задач ГА "БАЖ" можа выкарыстоўваць іншыя метады дзейнасці, не забароненыя законам.

3. СЯБРОЎСТВА Ў ГА "БАЖ"

3.1. Сябрам ГА "БАЖ" можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь або замежны грамадзянін, або асоба, без грамадзянства, якая дасягнула паўналецця, ажыццяўляе журналісцкую дзейнасць або садзейнічае яе развіццю ў Рэспубліцы Беларусь, прымае ўдзел у рэалізацыі мэты і задач ГА "БАЖ", прызнае і выконвае гэты Статут і Дэкларацыю прынцыпаў прафесійнай этыкі журналіста, зацверджаную З'ездам ГА "БАЖ".

3.2. Сяброўства ў ГА "БАЖ" фіксаванае.

3.3. Прыём у сябры ажыццяўляецца па рашэнні пярвічнай арганізацыі ГА "БАЖ" на падставе асабістай заявы ўступаючага і пры наяўнасці не менш чым дзвюх пісьмовых рэкамендацый сяброў ГА "БАЖ".

У выпадках, калі адсутнічае пярвічная арганізацыя ГА "БАЖ", прыём у сябры ГА "БАЖ" ажыццяўляецца на тых жа падставах Праўленнем ГА "БАЖ".

Рашэнне прымаецца, калі за яго пададзена не менш чым палова галасоў сяброў пярвічнай арганізацыі ці Праўлення ГА "БАЖ".

Рашэнне пярвічнай арганізацыі аб прыёме ў сябры ГА "БАЖ" павінна быць зацверджана Праўленнем ГА "БАЖ".

3.4. У выпадку адмоўнага рашэння пярвічнай арганізацыі пытанне аб сяброўстве ў ГА "БАЖ" можа быць разгледжана Радай ГА "БАЖ" па пісьмовай заяве ўступаючага ці сяб-

роў ГА "БАЖ", якія далі яму рэкамендацыі.

3.5. Сябрам ГА "БАЖ" выдаецца пасведчанне адпаведнага ўзору.

3.6. Сябар ГА "БАЖ" мае права:

3.6.1. Прымаць удзел у мерапрыемствах ГА "БАЖ", у працы органаў кіравання і кантролю ГА "БАЖ" з правам дарадчага голасу, а таксама выбіраць і быць абраным у гэтыя органы.

3.6.2. Атрымоўваць інфармацыю ад кампетэнтных асоб ГА "БАЖ", як выбарных органаў і ўносіць прапановы па пытаннях дзейнасці ГА "БАЖ".

3.6.3. Атрымоўваць дапамогу і абарону ад ГА "БАЖ", карыстацца паслугамі і маёмасцю ва ўстаноўленым Радай ГА "БАЖ" парадку.

3.6.4. Свабодна выйсці з ГА "БАЖ".

3.7. Сябар ГА "БАЖ" абавязаны:

3.7.1. Выконваць патрабаванні гэтага Статута і Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі журналіста.

3.7.2. Удзельнічаць у выкананні мэты і задач ГА "БАЖ".

3.7.3. Не дапускаць дзеянняў, якія наносяць ГА "БАЖ" матэрыяльную ці маральную шкоду.

3.7.4. Уплачваць сяброўскія ўзносы ў памеры, вызначаным З'ездам ГА "БАЖ".

3.8. Выхад сяброў ГА "БАЖ" ажыццяўляецца па пісьмовай заяве.

3.9. Выключэнне з сяброў ГА "БАЖ" ажыццяўляецца па рашэнні пярвічнай арганізацыі ці Рады ГА "БАЖ", калі за яго пададзена 2/3 галасоў сяброў, у выпадку грубага ці неаднаразовага парушэння Статута.

3.10. Па пісьмовай заяве выключанага пытанне аб сяброўстве ў ГА "БАЖ" можа быць разгледжана Радай ці З'ездам ГА "БАЖ", якія маюць права адмяніць рашэнне пярвічнай арганізацыі.

3.11. Асобам, якія унеслі вялікі ўклад ва ўмацаванне свабоды друку на Беларусі, Радай ГА "БАЖ" можа прысвойвацца званне ганаровага сябра ГА "БАЖ" з выдачай адпаведнага дыплома.

4. СТРУКТУРА І ВЫБАРНЫЯ ОРГАНЫ ГА "БАЖ"

4.1. Структуру ГА "БАЖ" складаюць пярвічныя арганізацыі (філіі) і кіруючыя органы ГА "БАЖ".

4.2. Пярвічнымі арганізацыямі ГА "БАЖ" з'яўляюцца раённыя, гарадскія, міжрэгіянальныя і іншыя прадугледжаныя Статутам ГА "БАЖ" філіі, якія самастойна вызначаюць характар сваёй дзейнасці ў межах Статута.

4.3. Філіі ГА "БАЖ" ствараюцца пры наяўнасці ў адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы не менш як трох сяброў ГА "БАЖ".

Са згоды Рады сябры ГА "БАЖ" могуць аб'ядноўвацца ў філіі ў адпаведнасці з профілем і спецыфікай прафесійнай дзейнасці.

4.4. Рашэнне аб стварэнні філіі рэгіструецца ў Праўленні ГА "БАЖ". Філіі ГА "БАЖ" бяруцца на ўлік адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

4.5. Філія ГА "БАЖ" можа набыць статус юрыдычнай асобы са згоды Рады ГА "БАЖ".

4.6. Вышэйшым органам філіі ГА "БАЖ" з'яўляецца агульны сход.

4.7. Агульны сход філіі ГА "БАЖ":

4.7.1. Вызначае спосабы і метады работы выбарных органаў філіі.

4.7.2. Абірае старшыню філіі, а пры наяўнасці пяці і больш сяброў - яго намесніка, скарбніка і рэвізора.

4.7.3. Вырашае пытанні аб сяброўстве ў ГА "БАЖ".

4.7.4. Абірае дэлегатаў на З'езд ГА "БАЖ".

4.8. Старшыня філіі склікае і вядзе сходы (канферэнцыі), арганізуе дзейнасць яе сяброў па выкананні рашэнняў органаў філіі і вышэйшых органаў ГА "БАЖ", па даверанасці прадстаўляе філію ў дзяржаўных органах і грамадскіх арганізацыях.

4.9. Скарбнік (дзе яго няма, старшыня) філіі збірае сяброўскія ўзносы, вядзе скарбовыя лісты.

4.10. Кантрольным органам філіі з'яўляецца рэвізор, які праводзіць свае праверкі не радзей чым раз у год. Вынікі праверак зацвярджаюцца сходам (канферэнцыяй) філіі.

4.11. Рашэнні філіі прымаюцца простай большасцю галасоў ад яе складу.

4.12. Рашэнні філій, звязаныя з выкарыстаннем матэрыяльных сродкаў, перададзеных філіі ў карыстанне рашэннем Рады ГА "БАЖ", павінны зацвярджацца Радай.

4.13. Вышэйшым органам ГА "БАЖ" з'яўляецца З'езд ГА "БАЖ", які склікаецца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў 3 гады. З'езд склікаецца Радай ці не менш чым 1/3 сяброў ГА "БАЖ".

Тэрмін правядзення, нормы прадстаўніцтва і парадак работы З'езда аб'яўляюцца не пазней чым за 20 дзён да прызначанага тэрміну. Надзвычайны З'езд склікаецца тэрмінова.

4.14. З'езд упаўнаважаны прымаць рашэнні, калі ў ім прыняў удзел больш за палову абраных дэлегатаў. Да выключнай кампетэнцыі З'езда адносяцца:

4.14.1. Прыняцце Статута ГА "БАЖ", унясенне ў яго змяненняў і дапаўненняў.

4.14.2. Вызначэнне асноўных напрамкаў і форм дзейнасці ГА "БАЖ".

4.14.3. Абранне прамым тайным ці адкрытым галасаваннем тэрмінам на тры гады Рады, Праўлення, Прэзідэнта, Віцэ-прэзідэнтаў, Кантрольна-рэвізійнай камісіі ГА "БАЖ", Камісіі па этыцы.

4.14.4. Заслухоўванне справаздач кіруючых, кантрольных органаў і адказных асоб ГА "БАЖ".

4.14.5. Зацвярджэнне справаздачы аб даходах і расходах ГА "БАЖ".

4.14.6. Прыняцце рашэння аб спыненні дзейнасці ГА "БАЖ".

З'езд можа разглядаць і іншыя пытанні, якія вынікаюць са статутнай мэты і задач.

4.15. Рашэнні З'езда прымаюцца большасцю галасоў удзельнікаў З'езда, рашэнні, звязаныя са Статутам, — 2/3 галасоў удзельнікаў З'езда.

4.16. Кіруючым органам ГА "БАЖ" з'яўляецца Рада ГА "БАЖ".

У склад Рады ўваходзяць сябры Праўлення ГА "БАЖ", а таксама іншыя сябры ГА "БАЖ", абраныя на З'ездзе.

Рада склікаецца на паседжанні не радзей як чатыры разы на год. Паседжанні Рады склікаюцца Праўленнем, Кантрольна-рэвізійнай камісіяй ці 1/3 сяброў Рады.

Рашэнні прымаюцца большасцю галасоў сяброў Рады.

4.17. Рада:

4.17.1. Арганізуе выкананне рашэнняў З'езда.

4.17.2. Распараджаецца сродкамі і маёмасцю ГА "БАЖ" згодна з заканадаўствам.

4.17.3. Абірае новых сяброў у склад Праўлення замест тых, што выбылі з яго складу.

4.17.4. Адмяняе рашэнні філій, якія супярэчаць Статуту і прынцыпам арганізацыі і дзейнасці ГА "БАЖ".

4.17.5. Уносіць змяненні і дапаўненні ў Статут адпаведна змяненням у заканадаўстве;

4.17.6. Вырашае іншыя пытанні дзейнасці ГА "БАЖ", якія не належаць да выключнай кампетэнцыі З'езда.

4.18. Праўленне ГА "БАЖ" ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва ГА "БАЖ" у перыяд паміж паседжаннямі Рады дзеля выканання яе рашэнняў і рашэнняў З'езда.

У склад Праўлення ўваходзяць Прэзідэнт, 4 Віцэ-прэзідэнты, а таксама сябры ГА "БАЖ", абраныя на З'ездзе ці Радай ГА "БАЖ" у адпаведнасці з п.4.17.3.

4.19. Праўленне ГА "БАЖ":

4.19.1. Каардынуе працу філій.

4.19.2. Наладжвае сувязі з дзяржаўнымі, грамадскімі і палітычнымі арганізацыямі ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі, рыхтуе мерапрыемствы ГА "БАЖ".

4.19.3. Арганізоўвае юрыдычную дапамогу сябрам ГА "БАЖ".

4.19.4. Прызначае Выканаўчага дырэктара, заключае з ім кантракт.

4.19.5. Зацвярджае ўзоры пячаткі, штампа ГА "БАЖ", пасведчання сябра ГА "БАЖ", іншых унутрыарганізацыйных дакументаў, а таксама вырашае іншыя пытанні, якія не належаць да выключнай кампетэнцыі З'езда і Рады ГА "БАЖ".

4.19.6. Зацвярджае рашэнні пярвічнай арганізацыі аб прыёме ў сябры ГА "БАЖ", а таксама прымае ў сябры ГА "БАЖ" у выпадках, прадугледжаных п.3.3. Статута.

4.20. Паседжанні Праўлення праводзяцца кожны месяц і склікаюцца па ініцыятыве Прэзідэнта, Віцэ-прэзідэнтаў ГА "БАЖ" або 1/3 сяброў Праўлення.

Рашэнні Праўлення прымаюцца простай большасцю яго сяброў і падпісваюцца Прэзідэнтам.

4.21. Прэзідэнт прадстаўляе ГА "БАЖ" у адносінах з дзяржаўнымі і недзяржаўнымі (ў тым ліку замежнымі) органамі, арганізацыямі, прадпрыемствамі, установамі, а таксама грамадзянамі. Прэзідэнт (а па яго даручэнні ці даручэнні Рады – Віцэ-прэзідэнт) ажыццяўляе:

4.21.1. Арганізацыю выканання рашэнняў кіруючых органаў ГА "БАЖ".

4.21.2. Аператыўнае кіраўніцтва Радай і Праўленнем.

4.21.3. Зацвярджае штатны расклад ГА "БАЖ".

4.22. Віцэ-прэзідэнты каардынуюць работу ГА "БАЖ" па вызначаных напрамках дзейнасці ў адпаведнасці з рашэннямі Рады.

4.23. Пры выхадзе з ГА "БАЖ" ці немагчымасці выконваць абавязкі Прэзідэнта гэтыя абавязкі па рашэнні Рады пераходзяць да аднаго з Віцэ-прэзідэнтаў на тэрмін да склікання З'езда ГА "БАЖ".

4.24. Выканаўчы дырэктар кіруе вытворча-гаспадарчай дзейнасцю ГА "БАЖ" і нясе за яе адказнасць.

4.25. Выканаўчы дырэктар прызначаецца на пасаду Праўленнем ГА "БАЖ" на тэрмін агавораны кантрактам, які заключаецца паміж ім і Праўленнем ГА "БАЖ".

Выканаўчы дырэктар дзейнічае ад імя ГА "БАЖ" на падставе даверанасці, заключае дамовы, са згоды Праўлення наймае і звальняе штатных супрацоўнікаў, прымае да іх меры заахвочвання і выносіць дысцыплінарныя спагнанні, арганізуе вядзенне справаводства і справаздач, выконвае іншыя абавязкі, прадугледжаныя кантрактам.

4.26. Кантрольным органам ГА "БАЖ" з'яўляецца Кантрольна-рэвізійная камісія ГА "БАЖ". Са свайго складу Кантрольна-рэвізійная камісія абірае старшыню камісіі.

Кантрольна-рэвізійная камісія ГА "БАЖ" збіраецца на паседжанні не радзей чым раз на год. Рашэнні Кантрольна-рэвізійнай камісіі прымаюцца большасцю ў 2/3 галасоў ад яе складу.

4.27. Кантрольна-рэвізійная камісія ГА "БАЖ" ажыццяўляе:

4.27.1. Кантроль за выкананнем Статута ў дзейнасці ГА "БАЖ".

4.27.2. Кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю, захаванасцю маёмасці ГА "БАЖ". Не радзей чым адзін раз на год праводзіць планавую рэвізію, пры неабходнасці звяртаецца па паслугі ў аўдытарскую арганізацыю.

4.27.3. Дапамогу рэвізорам філій.

4.28. Сябры Кантрольна-рэвізійнай камісіі не могуць уваходзіць у склад Рады, Праўлення, займаць пасады кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў гаспадарчых структур ГА "БАЖ". Сябры Кантрольна-рэвізійнай камісіі могуць удзельнічаць у працы паседжанняў кіруючых органаў ГА "БАЖ" з правам дарадчага голасу.

4.29. У структуры ГА "БАЖ" дзейнічае Камісія па этыцы, якая разглядае скаргі па фактах парушэння сябрамі ГА "БАЖ" Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі. Са скаргамі маюць права звяртацца органы дзяржаўнага кіравання, філіі ГА "БАЖ", рэдакцыі газет, любы сябар ГА "БАЖ", а таксама зацікаўленыя грамадзяне.

4.30. У склад Камісіі па этыцы ўваходзяць сябры ГА "БАЖ", якія валодаюць высокімі прафесійнымі і этычнымі якасцямі.

Камісія па этыцы дзейнічае на аснове Палажэння, якое распрацоўвае і зацвярджае Рада ГА "БАЖ".

4.31. У Камісію па этыцы ўваходзяць сем сяброў ГА "БАЖ", якія абіраюцца на З'ездзе. Сябры Камісіі абіраюць са свайго складу старшыню.

4.32. Камісія па этыцы адкрытым галасаваннем большасцю галасоў ад свайго агульнага складу выпрацоўвае рэкамендацыі, якія разглядаюцца Радай ГА "БАЖ". Рашэнне Рады па рэкамендацыях Камісіі па этыцы можа быць абскарджана на З'ездзе.

4.33. Рашэнні калегіяльных органаў ГА "БАЖ" афармляюцца пратаколамі.

5. КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ЎЛАСНАСЦІ ГА "БАЖ"

5.1. Ва ўласнасці ГА "БАЖ" могуць знаходзіцца будынкі, збудаванні, жыллёвы фонд, абсталяванне, транспарт, інвентар, грашовыя, валютныя сродкі, акцыі, іншыя каштоўныя паперы і іншая маёмасць, неабходная для ажыццяўлення прадугледжанай Статутам дзейнасці.

5.2. Грашовыя сродкі ГА "БАЖ" фарміруюцца:

5.2.1. З сяброўскіх узносаў, памер і перыядычнасць якіх вызначаюцца З'ездам ГА "БАЖ";

5.2.2. З мэтавага фінансавання ГА "БАЖ" і асобных праектаў з боку грамадзян і арганізацый, у тым ліку замежных;

5.2.3. З добраахвотных ахвяраванняў;

5.2.4. З паступленняў ад правядзення лекцый, выставак і іншых мерапрыемстваў;

5.2.5. З даходаў ад вытворча-гаспадарчай дзейнасці, якая ажыццяўляецца у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам;

5.2.6. З іншых не забароненых заканадаўствам паступленняў.

5.3. Сродкі і маёмасць ГА "БАЖ" выкарыстоўваюцца на ажыццяўленне статутнай дзейнасці, на ўтварэнне пры неабходнасці фондаў і рэзерваў ГА "БАЖ".

5.4. Усе паўнамоцтвы ГА "БАЖ", звязаныя з правам уласнасці, у прыватнасці прыняцце рашэнняў аб набыцці, распараджэнні і адчужэнні ўласнасці, ажыццяўляе Рада альбо па яе даручэнні Праўленне ГА "БАЖ".

5.5. ГА "БАЖ" можа перадаваць сваім філіям у карыстанне частку сваёй маёмасці для ажыццяўлення статутных мэтаў і задач ГА "БАЖ".

5.6. ГА "БАЖ" выплачвае падаткі і ажыццяўляе разлікі ў парадку і памерах, устаноўленых дзеючым заканадаўствам, нясе адказнасць за паўнату, дакладнасць і своечасовасць прадастаўлення справаздачнасці.

6. ПАРАДАК ЛІКВІДАЦЫІ ГА "БАЖ"

6.1. Ліквідацыя ГА "БАЖ", яе рэарганізацыя ажыццяўляюцца па рашэнні З'езда ГА "БАЖ", прынятым 2/3 галасоў ад агульнай колькасці абраных дэлегатаў, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам.

6.2. Сродкі і маёмасць, што застаюцца пасля ліквідацыі ГА "БАЖ", пасля задавальнення маёмасных прэтэнзій, выкарыстоўваюцца ліквідацыйнай камісіяй ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі ГА "БАЖ".

6.3. Дакументы ГА "БАЖ" пасля ліквідацыі ва ўстаноўленым парадку ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам здаюцца ва ўстановы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь па месцы знаходжання юрыдычнай асобы.

6.4. ГА "БАЖ" паведамляе аб сваёй ліквідацыі, рэарганізацыі і рэгістрацыі ў афіцыйных выданнях.

да ведама








СУД




НАМ НЕ НУЖНА
«достойная»







